# Паэт у нашых сэрцах

**10 кастрычніка ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбылося мерапрыемства "Барадулін у нашых сэрцах", прымеркаванае да 85-годдзя народнага паэта Беларусі Рыгора Барадуліна. Удзельнікамі гэтай урачыстай культурнай імпрэзы сталі ў тым ліку і школьнікі з Брэста.**



З 5 мая па 31 ліпеня Нацыянальная бібліятэка ў дыстанцыйнай форме праводзіла конкурс для вучняў 4—11 класаў. Яны павінны былі напісаць эсэ на цытату з аднаго з вершаў Рыгора Барадуліна, намаляваць плакат да яе і даслаць свае работы ў электронным выглядзе. У канцы жніўня сталі вядомы вынікі конкурсу, у адпаведнасці з якімі былі вызначаны тры пераможцы (1-е месца заняла Дар'я Грамакоўская з сярэдняй школы № 31 Брэста, 2-е месца падзялілі Алена Кір'янава і Марыя Ціхамірава з сярэдняй школы № 22 Брэста, а 3-е месца заняла Марыя Каралёва з сярэдняй школы № 115 Мінска), а таксама дзесяць лепшых работ. Усяго на конкурс было даслана каля 50 работ з усіх куткоў краіны. Годна на конкурсе паказалі сябе брэсцкія школьнікі, даслаўшы 10 работ.

З'яўляючыся па спецыяльнасці настаўніцай не толькі англійскай мовы, але і беларускай мовы і літаратуры, я вырашыла заахвоціць да ўдзелу ў конкурсе як сваіх вучняў, так і ўласных дзяцей. Акрамя таго, я куратар трох канкурсантаў: Лізаветы і Мікіты Сёміных, навучэнцаў сярэдняй школы № 26 Брэста, і Лізаветы Шыферштэйн, навучэнкі сярэдняй школы № 10 Брэста. Эсэ і плакаты Мікіты і Лізаветы ўвайшлі ў дзясятку лепшых работ.

Наведала мерапрыемства па запрашэнні Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі ўдава паэта — Валянціна Міхайлаўна Барадуліна. Сярод ганаровых гасцей былі і сябры народнага паэта. Вяла мерапрыемства Таццяна Сапега, куратар конкурсу, загадчык сектара навукова-праектнай работы Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Асноўнымі ўдзельнікамі сустрэчы сталі юныя чытачы, якія разам з бацькамі і настаўнікамі прыехалі на мерапрыемства з розных гарадоў і вёсак. Вучні чыталі вершы, а таксама ўласныя эсэ на цытаты з вершаў Рыгора Барадуліна. Намеснік генеральнага дырэктара па навуковай рабоце і выдавецкай дзейнасці Нацыянальнай бібліятэкі Аляксандр Суша падзякаваў школьнікам за ўдзел у конкурсе. Ён адзначыў важнасць гэтага мерапрыемства для культурнага развіцця асобы.

Сустрэча завяршылася ўрачыстым узнагароджаннем удзельнікаў конкурсу дыпломамі і кніжнымі падарункамі, сумеснай фотасесіяй і экскурсіяй па бібліятэцы з наведваннем назіральнай пляцоўкі. Спадзяюся, мерапрыемства назаўсёды застанецца ў сэрцах яго ўдзельнікаў і будзе садзейнічаць развіццю любові да чытання.

**Святлана СЁМІНА,**
**настаўніца англійскай мовы**
**сярэдняй школы № 10 Брэста.**
**Фота аўтара.**